# Саюз

***Віталь Цыганкоў***

„*Саюз* непарушны рэспублік свабодных зьяднала навекі вялікая Русь“ — гэта, бадай, першая асацыяцыя, якая прыходзіць у галаву пра слова „*саюз*“. Пераклад гімну СССР гучыць настолькі ж ненатуральна, наколькі чужародным для беларускай мовы зьяўляецца слова „*саюз*“. Гэта якраз адно з тых небеларускіх па сваім паходжаньні словаў, якія займаюць неадэкватна вялікае месца ў сучаснай беларускай мове і рэчаіснасьці.

Ня менш чужародныя для беларускай дзяржаўнасьці і незалежнасьці і палітычныя зьвязы, якія называліся і называюцца словам „*саюз*“.

Апошнімі гадамі ў „*саюза*“ паступова адваёўвае пазыцыі „зьвяз“, упершыню ўведзены Янам Станкевічам. Апроч таго, ужываюцца словы „злучэньне“, „таварыства“, „аб'яднаньне“, „хаўрус“, „згуртаваньне“, „суполку“, „задзіночаньне“. Як здаецца, слова „*саюз*“ хутка патрапіць у тую ж сытуацыю, у якой апынулася роднаснае яму па духу слова „савет“, якое цяпер ужываецца для азначэньня менавіта небеларускіх — савецкіх альбо расейскіх рэаліяў.

*Савецкі Саюз* застанецца „*саюзам*“, гэтаксама як *саюз Беларусі і Расеі*, а эўрапейскае аб'яднаньне нацыяў мы называем „Эўразьвязам“.

# Свабода

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Свабодка*, *Свабоданька* і *Свабодачка*, *Слабодка* і *Слабада*...

Добры, вольны й праўдзівы — *свабодны*. Злосны, паднявольны й хлусьлівы — *несвабодны*.

Лексыкограф Памва Бярында пісаў, што *свабода* — гэта *вольнасьць, свабоднасьць, наслаждзеньне, любадараваньне* і *любачэсьце*.

У 20-я гады нашага стагодзьдзя Вацлаў Ластоўскі вызначыў: „*Свабода — свая воля, вольнасьць*“, і дадаў найменьне носьбітаў *свабоды*: *свабоднік, свабодніца*.

У 70-я пазыўнымі беларускай „*Свабоды*“ былі радкі з Купалавага верша: „Бясьсьмертнае слова, ты, роднае слова! Ты крыўды, няпраўды змагло; Хоць гналі цябе, накладалі аковы, Дый дарма: жывеш, як жыло!“

Беларускія вернікі штодня зьвяртаюцца да Бога з адной малітвай: „Зрабі *свабоднай*, зрабі шчасьлівай, краіну нашу і наш народ!“

# Сельпо

***Вінцэсь Мудроў***

*Сельпом* — слова гэтае ў гутарковай беларускай мове скланялася — называлі счарнелую, перабудаваную з кулацкай хаты гандлёвую кропку, якая адначасова была і своеасаблівым жаночым клюбам.

Жанкі штодня зьбіраліся там у чаканьні падвозу хлеба ды абменьваліся плёткамі. Дамінантнай фігурай у клюбе была загадчыца *сельпа*, зьвяртаючыся да якой, нават старыя цёткі ўжывалі імя па бацьку:

— А пакажы ж ты мне, Міронаўна, вунь тую адзежыну...